кніжкі для дзяцей. Друкаваў парады для хатніх гаспадынь.

**ЖАНОЧАЯ РЫФМА**, від рыфмы, у якой націск падае на 2-і ад канца склад сугучных слоў. Частае выкарыстанне Ж.р. класікамі бел. л-ры тлумачыцца ўплывам на іх творчасць польск. мовы (з яе пастаянным націскам на перадапошнім складзе) і фальклору, у якім гэты від рыфмы пануе:

Зялёная вішня
З-пад кораня выйшла.
Аддала мяне мама,
Дзе я непрывычна.
(Беларуская народная песня)

Аўтары выкарыстоўвалі эстэтычныя магчымасці Ж.р., якая спрыяе ўзнікненню асаблівага, меладычнага рытму. Гэтай рыфмай амаль цалкам напісана паэма Я.Коласа «Новая зямля». Ж.р. выкарыстаў Я.Купала ў паэмах «Калека», «Адплата кахання», «За што?», «На Дзяды», «Тарасова доля». У паэме «Бандароўна», дзе таксама скарыстана Ж.р., рыфмуюцца перакрыжаваныя 2-і і 4-ы склады:

Не віхор калыша лесам,
Не ваўкі заводзяць,
Не разбойнікі талпою
За здабычай ходзяць.

Часта Ж.р. выкарыстоўваецца поруч з мужчынскай (паэмы «Зімою», «Нікому», «На Куццю», «Магіла льва» Я.Купалы і інш.). У некаторых творах узнікненне Ж.р. не ў апошнюю чаргу звязана з імем гал. героя, якое часта рыфмуецца і мае націск на перадапошнім складзе (паэмы «Бандароўна» Я.Купалы, «Янук Сяліба» М.Танка, «Васіль Каліна» М.Кавыля).

*А.М.Петрушкевіч.*

**ЖАНО́ЧЫ ІНСТЫТУТ «ЭНВІ́ЛА»**, прыватная вышэйшая навучальная ўстанова. Існаваў у 1994—2012 у г. Мінск. Засн. як жаночы недзярж. ін-т з мэтай адраджэння традыцый і прэстыжу жаночай адукацыі.

**ЖАНР** [франц. genre ад лац. genus (generis) род, від], у большасці відаў мастацтва ўнутранае падраздзяленне, якое склалася гістарычна, тып устойлівай структуры маст. твора, спосаб яго змястоўнай і кампазіцыйнай арганізацыі.

У ф а л ь к л о р ы, складаная сістэма твораў, гістарычна абумоўленая сац.-быт. стылявымі, сэнсавымі, функцыянальнымі, марфалагічна-структурнымі, муз.-паэт. і інш. асаблівасцямі. Уключае нар. песенныя, вусна-празаічныя, гульнявыя, драм., інструм., харэагр. і інш. творы. Пры вызначэнні Ж. важна ведаць, які спосаб тыпізацыі, родавы прызнак ляжыць у аснове іх класіфікацыі. Так, паводле маст. прыроды, спосабу адлюстравання рэчаіснасці нар. песні падзяляюцца на 2 роды: эпічны і лірычны. Існуюць і пераходныя формы: лірыка-эпічныя і лірыка-драм. Пры класіфікацыі Ж. нельга абысціся якім-небудзь адзіным прынцыпам. Важна ўяўляць сабе кожны з іх і разумець, як ім карыстацца. Напр., у аснове класіфікацыі нар. песень выкарыстоўваюцца асн. прынцыпы: сацыялагічны, тэматычны, этнаграф., эстэтычны. Сацыялагічны прынцып патрабуе падзелу песень у адпаведнасці з іх прыналежнасцю да сац. груп: сялянскія песні, рабочы фальклор, песні рэкруцкія і салдацкія, казацкія, турэмныя і інш. Тэматычны прынцып мае на мэце вылучэнне песень на антыпрыгонніцкія тэмы, пра каханне, пра жаночую і мужчынскую долю і г.д. У адпаведнасці з эстэтычным прынцыпам песні падзяляюцца на працоўныя, заклінальныя, велічальныя, гераічныя, элегічныя, жартоўныя і сатыр. Гэтыя творы выяўляюць эмацыянальныя адносіны чалавека да рэчаіснасці, яго пачуцці і перажыванні: яны не звязаны з абрадамі або звычаямі, складаюць пазаабрадавую лірыку. Этнамузыколагі падзяляюць яе на частыя і працяжныя песні. Згодна з этнаграф. прынцыпам песні падзяляюцца на каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя і пазаабрадавыя. Першыя прадстаўляюць песні калядныя, масленічныя, валачобныя, траецкія, купальскія і пятроўскія, жніўныя, восеньскія, талочныя. У сямейных вылучаюцца песні хрэсьбінныя, вясельныя і галашэнні. Пазаабрадавыя песні складаюцца з любоўных, сямейна-бытавых, сац.-бытавых, сатыр. і жартоўных, карагодных і гульнявых, дзіцячых песень. Складанай з'яўляецца ўнутрыжанравая класіфікацыя Ж. Напр., у кожным томе акадэмічнага выдання «Беларускі фальклор» яна мае сваю спецыфіку. Так, жніўныя песні сістэматызаваны па асн. этапах жніва, г.зн. па абрадава-функцыянальнаму тэматычнаму прынцыпу. Сярод зімовых песень піліпаўскія ўпадкаваны ў адпаведнасці з тэматычна-храналагічным прынцыпам, а калядкі і шчадроўкі — па ідэйна-тэматычным змесце ў канкрэтных раздзелах. Пазаабрадавыя творы змешчаны адпаведна тэматычнаму прынцыпу. У шматтомным зводзе «Беларуская народная творчасць» жанры вуснай прозы аб'яднаны па тэмах: «Казкі пра жывёл», «Чарадзейныя казкі», «Сацыяльна-бытавыя казкі», «Легенды і паданні», «Анекдоты, жарты, гумарэскі». Казкі ўпадкаваны па сюжэтных тыпах. Як жанры іх вызначаюць, карыстаючыся толькі сукупнасцю некалькіх прыкмет, у прыватнасці, наяўнасцю наўмыснай выдумкі і фантастыкі. Прыказкі, прымаўкі і загадкі вылучаны па асн. сферах жыцця і побыту народа. Абрадавыя ігрышчы, нар. гульні і нар. драма прадстаўляюць драм. Ж. Нар. харэаграфія сістэматызавана па марфалагічна-структурным прынцыпе і ўключае карагоды, традыц. танцы, кадрылі, полькі, гар. быт. танцы, скокі і інш. Ж. ў фальклоры: песенныя, танцавальныя, вясельныя маршы, імправізацыі, сігнальныя найгрышы складаюць спецыфіку нар. інструм. музыкі.

У л і т а р а т у р ы, гістарычна сфарміраваны тып мастацкага твора, які належыць да аднаго і таго ж літ. роду. Характарызуецца агульнымі прынцыпамі (тэматыка, кампазіцыя, вобразны лад, аб'ём) маст. ўвасаблення рэчаіснасці і адпаведнымі гэ-

тым прынцыпам устойлівымі структурнымі ўласцівасцямі. Да эпічных Ж. належаць *эпапея*, *быліна*, *байка*, *казка*, *раман*, *аповесць*, *апавяданне*, *навела* і інш. Прыкладам лірычных Ж. выступаюць *балада*, *ода*, *песня*, *элегія*, *гімн*, лірычны верш, *раманс* і інш. У драм. Ж. уваходзяць *драма*, *трагедыя*, *камедыя*, *вадэвіль* і інш. Пералічаныя гіст. формы складаюць парадыгму кананічных жанраў. На мяжы 18—19 ст., асабліва ў эпоху рамантызму, актуалізавалася роля творчай асобы: Ж. дэкананізаваліся, вызваліліся ад традыц. класіфікацыйных маркёраў, а аўтарская свядомасць атрымала свабоду ў адкрыцці жанравых наватвораў. Узніклі не толькі новыя Ж., але міжжанравыя і міжродавыя ўтварэнні (*трагікамедыя*, *ліра-эпічная паэма* і інш.). З эпохай мадэрнізму і постмадэрнізму, пазначанай тэндэнцыяй рэлятыўнасці індывід. маст. мыслення, працэс жанравай дыфузіі ў л-ры ўзмацніўся. Ж. пакінулі за сабой толькі каркасы жанравых мадэляў, што працягваюць традыцыю ўзору, і актывізавалі пошукі новага інварыянта для некананічных маст. форм.

Існуюць 2 асн. падыходы ў вызначэнні схемы Ж.: 1-ы родавы падзел л-ры рэалізуе сябе праз разгалінаваную сістэму род — Ж., 2-і — род — Ж. — від. У сучасным літ.-знаўстве перавага аддаецца менавіта двухступеннай схеме родава-жанравых адносін як менш супярэчлівай. Ж. разглядаюцца як сістэма эстэтычнай камунікацыі з чытачом (функцыянальная значнасць Ж. у пэўную літ. эпоху); як канкрэтны спосаб пабудовы карціны ці вобраза свету, замацаваны за пэўным тыпам светасузірання (Ж. як «змястоўная форма»); як асобны аспект дынамічнай маст. структуры, здольнай захоўваць уласную тоеснасць пры пастаянным абнаўленні.

У бел. л-ры прадстаўлены практычна ўсе Ж., уласцівыя для еўрап. і сусв. маст. пісьменнасці. Разам з тым у ёй ёсць і ўнікальныя прыклады: ананімная гутарка — у традыцыі 19 ст., версіфікацыйная практыка А.Разанава — у сучасны перыяд.

У м а с т а ц т в е, умоўная катэгорыя дыферэнцыяцыі твораў мастацтва паводле прадмета адлюстраванага, сюжэтна-тэматычнага прынцыпу (партрэт, пейзаж, нацюрморт, *анімалістычны жанр*, *гістарычны жанр*, *бытавы жанр*, *батальны жанр*, *міфалагічны жанр*, *эратычны жанр* і г.д.), адносінах аўтара да адлюстроўваемага аб'екта (карыкатура, шарж) і г.д. Існуюць простыя (чыстыя) формы Ж. і змяшаныя, пераходныя. Найб. сукупнасць жанравых структур уласцівая жывапісу і графіцы. У скульптуры, акрамя традыц. тэматычных Ж., існуе класіфікацыя паводле мэтавага прызначэння (помнік, надмагілле, рэльеф, медаль). Развіццё і эвалюцыя Ж. у мастацтве Беларусі абумоўлена этапамі яго гіст. развіцця. Элементы жанравых адрозненняў вядомыя спрадвеку. У мініяцюрах і гравюрах 15—16 ст. прысутнічалі кампазіцыі гіст., батальнага, быт. Ж., якія сталі больш папулярнымі ў графіцы (ксілаграфіях, афортах) 17—18 ст., у жывапісе 18—19 ст. Станаўленне міфал. Ж. прасочвалася ў старабел. манумент. жывапісе, кніжнай графіцы, іканапісе (15—16 ст.). Пад уплывам ідэй Адраджэння ў жывапісе 14—16 ст. адбывалася станаўленне партрэтнага Ж., пашыралася яго тыпалогія, адбывалася жанравая дыферэнцыяцыя. Розныя формы партрэта (сармацкі, рыцарскі, пахавальны і інш.) папулярныя ў графіцы, жывапісе, мемар. пластыцы 16—18 ст. Пейзажны Ж. у графіцы ўзнік у 16 ст. і канчаткова аформіўся ў жывапісе ў 18—19 ст. Зварот да рэаліст. традыцый у бел. мастацтве 19 ст., імкненне быць бліжэй да жыцця выклікалі адмысловую цікавасць да быт. Ж., сельскага і гар. пейзажа, паўплывалі на развіццё партрэта і нацюрморта. У бел. мастацтве 1920-х гг. прыярытэт аддаваўся агітацыйным Ж., творам хранікальна-дакумент. характару. Адметнай рысай творчых пошукаў прадстаўнікоў авангарднага мастацтва была павышаная цікавасць да міфатворчасці. У рамках фантаст. Ж. у бел. мастацтве 20 ст. ствараліся ілюстрацыі да фантаст. казак, легенд, казачных твораў бел. пісьменнікаў. У жывапісе 1930—70-х гг. папулярная тэматычная карціна як спецыфічны Ж., які адлюстроўваў падзеі мінулага або тагачаснага жыцця. Тэматычная карціна ўключала ў сябе творы розных Ж. У бел. мастацтве апошняй трэці 20 ст. адбылося змяшэнне, дыфузія Ж., што прывяло да стварэння складаных, памежных міжжанравых форм. Традыц. Ж. імкнуцца пашырыць свае звычайныя змястоўныя і эмацыйныя межы. Творчы працэс выходзіць за рамкі цвёрдых класічных канонаў і традыц. жанравых дэфініцый, узнікаюць новыя Ж. На мяжы 20—21 ст. устанаўліваюцца яшчэ больш гнуткія межы паміж Ж., што нярэдка вядзе да з'яўлення прамежкавых жанравых утварэнняў.

У м у з ы ц ы, род і від музычных твораў у сувязі з іх паходжаннем і ўмовамі існавання, спосабамі выканання і ўспрыняцця, зместам і формай сачынення. Прычынным вытокам Ж. з'яўляецца працэс бытавання музыкі ў грамадстве (напр., ваенныя маршы, гімны і г.д.). Класіфікацыя Ж.: п а в ы к а н а л ь н і ц к і х с р о д к а х: а) інструм. музыка — аркестравая: сімф. (для вял., малога, камернага і нар. аркестраў), камерная (ансамблевая — трыа, квартэты, дуэты і інш.), сольная (фартэпіянная, скрыпічная); б) вак. музыка — сольная, ансамблевая, сола з акампанементам, харавая; в) вак.-інструм. музыка — араторыя, кантата, вак.-інструм. ансамблі; г) тэатр. музыка — опера, балет, муз. камедыя, музыка да пастановак драм. тэатра; п а з м е с ц е Ж.: лірычны, драм., эпічны; п а ж ы ц ц ё в ы м п р ы з н а ч э н н і і б ы т а в а н н і ў с о ц ы у м е: а) прапанаваная музыка, або музыка акадэмічнай традыцыі, г.зн. тая, якая з'яўляецца носьбітам самаст. маст. вобразу і патрабуе спец.

ведаў і падрыхтоўкі для ўспрыняцця (Ж. музыкі акадэмічнай традыцыі: сімфоніі, оперы, кантаты, араторыі і інш.), б) прыкладная, або ўжытковая, якая выконвае дапаможную функцыю і не стварае самаст. маст. вобраз (музыка да драм. спектакляў, к/фільмаў), в) эстр. (Ж. песні, мюзікла, *джаза*, дзе ёсць асаблівая ўласная класіфікацыя, рок-оперы і інш.); па спосабах і ўмовах выканання — канцэртна-філарманічныя Ж. (сімфонія, камерная, кантатна-аратарыяльная і харавая музыка) і тэатр. Ж. (опера, балет і інш.); п а т ы п е т в о р ч а с ц і — прафес. (г.зн. створаная прафес. кампазітарам) і аматарская (г.зн. створаная самадзейнымі музыкантамі) музыка. Асобную групу складаюць Ж. муз. фальклору і Ж. праваслаўных песнапенняў (песняспеваў), якія займаюць пэўнае месца ў музыцы акадэмічнай традыцыі. Фарміраванне жанравай сістэмы ў акадэмічнай музыцы пачалося ў лоне царк. музыкі, што было звязана з дыферэнцыяцыяй выканальніцкіх складаў, стварэннем новых муз. інструментаў і эстэтычнымі патрабаваннямі грамадства. Некаторыя Ж. значна трансфарміраваліся ў выніку змянення маштабаў твораў (напр., манаопера), зліцця Ж. (напр., сімфонія для салірукочага інструмента, опера-балет), уздзеяння на музыку акадэмічнай традыцыі субкультурных з'яў (напр., эстрады). Усе Ж. знайшлі ўвасабленне ў творчасці бел. кампазітараў: опера («У пушчах Палесся» А.Багатырова, «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава, «Маленькі прынц» А.Мдывані, «Джардана Бруна» С.Картэса, «Новая зямля» Ю.Семянякі), балет («Легенда пра Уленшпігеля» Я.Глебава, «Жарсці (Рагнеда)» А.Мдывані, «Пасля балю» Г.Вагнера), манаопера («Адзінокі птах» А.Залётнева), камерная опера («Запіскі вар'ята» В.Кузняцова), сімфонія (М.Аладаў, А.Багатыроў, Я.Глебаў, А.Мдывані, Д.Смольскі, Я.Цікоцкі), кантата (М.Аладаў, А.Багатыроў), араторыя (Я.Глебаў, А.Мдывані, С.Картэс, Д.Смольскі), канцэрт (В.Войцік, Д.Камінскі, С.Картэс, А.Мдывані, Д.Смольскі), хары (У.Алоўнікаў, А.Багатыроў, А.Мдывані), песні (У.Алоўнікаў, І.Лучанок, Ю.Семяняка).

У б а л е ц е, род і від балетнага спектакля, які вызначаецца асаблівасцямі яго сувязі з л-рай, тэатрам і музыкай. Вытокі Ж. ў працэсе бытавання танца ў грамадстве (напр., нар. танец, тэатр. сцэны на святах, маскарадах і г.д.). Яго змест і форма адлюстроўваюцца з дапамогай муз.-харэагр. вобразаў. Да 18 ст. балет быў састаўной часткай опернай дзеі альбо музыкі да драмы (*дывертысмент*, або танц. інтэрмедыя, у які ўваходзілі оперныя і драм. пастаноўкі міфал. характару). У працэсе развіцця Ж. мяняліся ў залежнасці ад маст. кірунку. Яны адносна ўстойлівыя гістарычна, характарызуюцца шматварыянтнасцю адлюстравання жыцця ў спектаклі і ствараюць у сучасным балетным мастацтве сістэму. Ж. класіфікуюцца п а в о д л е с ц э н а р н а й (л і т.-с ю ж э т н а й) а с н о в ы (з 19 ст.): эпічныя («Салавей» М.Крошнера); лірычныя («Жызэль» А.Адана); драм. («Альпійская балада» Я.Глебава—А.Дадышкіліяні); лірыка-эпічныя («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага); лірыка-драм. («Легенда пра Уленшпігеля» Я.Глебава); эпіка-драм. («Спартак» А.Хачатурана); балет-паэма («Курган» Я.Глебава, «Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева); балет-раман («Святло і цені» Г.Вагнера—А. Андрэева); балет-казка («Маленькі прынц» Я.Глебава, «Беласнежка і сем гномаў» Б.Паўлоўскага, «Тры парасяці» С.Кібіравай); алегарычны балет («Мара» Я.Глебава); філасофскі балет («Стварэнне свету» А.Пятрова); п а в о д л е в і д а ў т э а т р.-с ц э н і ч н а г а м а с т а ц т в а (з 19 ст.): балет-трагедыя [«Страсці (Рагнеда)» А.Мдывані]; балет-камедыя («Падстаўная нявеста» Г.Вагнера); балет-драма («Князь-возера» В.Залатарова); п а в о д л е а д з і н с т в а д р а м а т у р г і і і м у з ы к і (з 19 ст.): балет-п'еса («Партызанскія дні» Б.Асаф'ева); балет-сімфонія («Шчыгрынавая скура» А.Мдывані, «Гамлет» С.Бельцюкова); п а в о д л е н а я ў н а с ц і с ю ж э т а (з 20 ст.): сюжэтныя («У гонар Марыуса Пеціпа» Л.Мінкуса); бессюжэтныя («Кругаверць» А.Залётнева); п а в о д л е в ы к а р ы с т а н н я п л а с т ы ч н а г а р а ш э н н я: танц. («Балеро» М.Равэля); пантамімныя («Свет не канчаецца ля дзвярэй дома» Г.Малера—Ж.Дзюпрэ); п а в о д л е к о л ь к а с ц і д з е й: многаактовыя («Доктар Айбаліт» І.Марозава); аднаактныя («Зала чакання» А.Хадоскі, «Серэнада» П.Чайкоўскага); балетныя мініяцюры («Бачанне ружы» К.Вебэра). У 20 ст. балеты-драмы трансфармаваліся ў харэадрамы, а таксама ў данс-спектаклі, уласцівыя мадэрну. У канцы 20 — пач. 21 ст. многія пастаноўкі пачалі базіравацца на ўласнай канцэпцыі харэографа, яго харэагр. школе. Дзякуючы аўтарскаму стылю гал. дасягненнем балета стала яго сімфанізацыя, якая закранула найперш харэаграфію. У выніку музыка пачала адыгрываць «акампаніруючую», прыкладную ролю.

У к і н о, умоўная катэгорыя ўнутрывідавай дыферэнцыяцыі маст. фільмаў у кінематографе, якая склалася гістарычна. Ж. выдзяляюцца на аснове супастаўлення кіналент па сюжэтах, тэмах, дэкарацыях, выкарыстанні тыпажоў, вобразаў, характэрных персанажаў. У маст. кіно яны не маюць дакладных межаў. Большасць маст. фільмаў можа быць аднесена да розных жанравых груп п а с п о с а б у б у д о в ы м а с т. в о б р а з а — драматычныя (трагедыя — «Ворагі», 2007, рэж. М.Можар; кінакамедыя — «Дасціш Фантасціш», 2009, рэж. А.Канановіч, «Трамвай у Парыж», 2010, рэж. Д.Лось; трагікамедыя — «На спіне ў чорнага ката», 2008, рэж. І.Паўлаў; драма — «Бальная сукенка», 2003, рэж. І.Волах, «Вам — заданне», 2004, рэж. Ю.Бяржыцкі, «Зграя», 2008, рэж.

Д.Зайцаў, «Брэсцкая крэпасць», 2010, рэж. А.Кот; меладрама — «Рыфмуецца з каханнем», 2007, рэж. А.Яфрэмаў, «Пакуль мы жывыя», 2008, рэж. С.Сычоў, «На ростанях», 2011, рэж. В.Дудзін); эпічныя (кінаэпапея — «Глыбокая плынь», 2005, рэж. І.Паўлаў; кінараман — «Дзікае паляванне караля Стаха», 1980, рэж. В.Рубінчык; кінааповесць — «Дунечка», 2004, рэж. А.Яфрэмаў, «Тры талеры», 2005, рэж. І.Чацверыкоў, «Кадзет», 2009, рэж. В.Дудзін; кінанавела — «Нябачаны край», 2006, рэж. В.Аслюк); лірычныя (кінапаэма — «Птушкі без гнёздаў», 1996, рэж. В.Дудзін; лірычная навела — «Я памятаю...», 2005, рэж. С.Сычоў); н а а с н о в е ф а л ь к л о р у (казка — «Навагоднія прыгоды ў ліпені», 2008, рэж. І.Паўлаў, А.Турава; прытча — «Рака жыцця», 2009, рэж. І.Бышнёў); п а п р а д м е ц е а д л ю с т р а в а н н я — прыгодніцкі фільм («Маёр Ветраў», рэж. А.Франскевіч-Лайе, «Радзіма ці смерць», рэж. А.Крыніцына, абодва 2007); дэтэктыў («Паміж жыццём і смерцю», 2002, рэж. Д.Зайцаў, «Цень самурая», 2008, рэж. І.Чацверыкоў, «Немец», 2010, рэж. А.Яфрэмаў); трылер («Масакра», 2010, рэж. А.Кудзіненка); фільм-катастрофа («Першая катастрофа», 2009, рэж. З.Катовіч); баявік («У чэрвені 41-га», рэж. А.Франскевіч-Лайе, «Крапавы бярэт», рэж. А.Голубеў, абодва 2008); гістарычны («Анастасія Слуцкая», 2003, рэж. Ю.Ялхоў, «Вока за вока», 2010, рэж. Г.Палока); фантастычны («Рыжык у Залюстаркоўі», 2010, рэж. А.Турава); музычны («Аднойчы ў Барахляндыі», 2010, рэж. М.Сабураў). Існуюць і больш вузкія жанравыя азначэнні Ж.: сатыр., эксцэнтрычная, муз. кінакамедыя, біягр. фільм, паліт. кінадэтэктыў, сац. ўтопія і інш. Кожны Ж. мае свае канвенцыі — спецыфічнае асяроддзе, ролі, падзеі, каштоўнасці, якія вызначаюць канкрэтныя Ж. і іх паджанры. Выбар Ж. задае дакладныя межы магчымага сюжэта. Цэнтр. для жанравага фільма з'яўляецца ўзаемадзеянне паміж канвенцыямі і навацыямі, знаёмым і новым. Традыц. Ж., пераінтэрпрэтаваны, пастаўлены пад сумненне, дакладна даследаваны, прынята называць рэвізіянісцкім.

*Літ.*: Ц у к к е р м а н В. Музыкальные жанры и основы музыкальных форм. М., 1964; Ч у р к о Ю. Белорусский балет. Минск, 1966; Я е ж. Белорусский хореографический фольклор. Минск, 1990; Ф я д о с і к А.С. Прынцыпы класіфікацыі і выдання фальклорных твораў у шматтомным зводзе беларускай народнай творчасці. Мінск, 1983; Т о м а ш е в с к и й Б.В. Теория литературы. Поэтика. 1996; Д у л о в а Е. Балетный жанр как музыкальный феномен (русская традиция конца XVIII — начала XX века). Минск, 1999; Р а г о й ш а В.П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мінск, 2001; Н а з а й к и н с к и й Е. Стиль и жанр в музыке. М., 2003.

*А.М.Аляхновіч* (фальклор), *І.В.Жук* (літаратура), *М.Л.Цыбульскі* (мастацтва), *Т.Г.Мдывані* (музыка), *А.В.Фогт* (балет), *Д.М.Гіргель* (кіно).

**ЖА́НРЫ МАЛЫ́Я**, фальклорныя творы, аб'яднаныя паводле прыметы як невял. па аб'ёме. Гэта найперш — *прыказкі*, прымаўкі, *загадкі*, нар. афарыстычныя выслоўі (трапныя выразы, параўнанні, *скорагаворкі*, *каламбуры*, застольныя прыгаворкі і *тосты*, вітанні, зычэнні, развітанні, засцярогі, прысяганні, бажба, *праклёны*, абзыванні, ганьбаванні, *дражнілкі*). Да Ж.м. адносяць таксама *жарты*, *анекдоты*, *былічкі*, монастрафічныя творы песеннага характару (*прыпеўкі* і інш.), вербальныя кампаненты розных абрадаў, замоўныя і магічныя формулы. Для многіх твораў Ж.м. характэрны ёмістае і вобразнае абагульненне, дасціпнасць, жарт. *А.Ю.Лозка.*

**ЖАРАБКО́ВІЧЫ**, вёска ў Ляхавіцкім р-не. За 12 км на ПнУ ад г. Ляхавічы, 15 км ад чыг. ст. Клецк на лініі Баранавічы—Асіповічы, 232 км ад Брэста, на аўтадарозе Баранавічы—Клецк. Цэнтр Жарабковіцкага с/с. 252 гаспадаркі, 693 ж. (2011).

Вядомы з 15 ст. як маёнтак у Клецкай воласці Навагрудскага павета Троцкага ваяв. ВКЛ. З 1507 у Навагрудскім ваяв. У 1537 у Ляхавіцкай воласці. З 1791 у Случарэцкім павеце. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, у Нясвіжскім павеце Мінскай губ. З 1796 у Слуцкім павеце. У 1847 вёска ў Ляхавіцкай воласці, 37 двароў, 277 ж. У 1897 — 72 двары, 532 ж., магазін. У 1909 — 108 двароў, 652 ж. З 1919 у БССР. З 1921 у Польшчы, у Ляхавіцкай гміне Баранавіцкага павета Навагрудскага ваяв. З 1939 зноў у БССР. З 15.1.1940 у Ляхавіцкім р-не Баранавіцкай вобл. З 12.10.1940 цэнтр сельсавета. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да пач. ліп. 1944 Ж. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. З 8.1.1954 у Брэсцкай вобл. З 16.7.1954 да 3.7.1972 у Падлескім с/с. У 1970 — 617 ж. У 1997 — 250 гаспадарак, 639 ж.

У 2011 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, ФАП, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», 2 магазіны. Магіла ахвяр фашызму, брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**ЖАРГАНІ́ЗМЫ**, словы жаргоннай лексікі, якія з пэўнай стыліст. мэтай ужываюцца за межамі жаргону (гл. *Жаргон*) у маст. л-ры або ў гутарковай мове. У маст. кантэкст Ж. ўводзяцца з мэтай характарыстыкі дзеючых асоб або апісання асяроддзя, у якім знаходзяцца персанажы:

«— Ану, з гарызонта...
Башку адгрызу...
І нібы з роздумам:
— Тля ты копчаная...

І, як спуджаны верабей, кідаўся каторы філон на другі канец барака, зашываўся на нары, і чуваць было, як сапеў ён з перапуду, прыводзіў да парадку свае думкі, пачуцці — то ж дагадзі чалавеку, — і, аддыхаўшы, набіраўся смеласці — на шэпты, спачуванні, уздыхі» (М.Лынькоў. «Баян»). Ж. — гэта штучныя (умоўныя) назвы агульнавядомых паняццяў і рэалій аб'ектыўнай рэчаіснасці, таму выкарыстанне Ж. у творах маст.